# ПАСХАЛЬНАЯ МУЗЫЧНАЯ СПАДЧЫНА РЫМСКА-КАТАЛІЦКАЙ ЦАРКВЫ НА БЕЛАРУСІ ЯК АБ’ЕКТ ТРАДЫЦЫЙНАЙ КУЛЬТУРЫ

***В. І. Раманенкава,***
*аспірант БДУКМ*

Беларуская традыцыйная культура – гэта жанравае багацце і духоўная глыбіня фальклору, які, як вядома, гістарычна і змястоўна-вобразна цесна звязаны з хрысціянствам і рэлігійнымі вераваннямі папярэдніх часоў.

Пасха – найвялікшае каляндарнае свята, у якім заключаецца выключная адметнасць, самабытнасць беларускага абрадава-святочнага календара. Гэта свята насычана святочна-мастацкай культурай велічнага, мажорнага, гімнічнага, жыццясцвярджальнага характара. Святкаванне Пасхі ва ўсім хрысціянскім свеце суправаджаецца вялікай колькасцю музычных твораў з рэлігійным зместам альбо тэкстам. Зазначым, што аднолькава папулярнай з’яўляецца музыка, як літургічная, так і бытавая, фальклорная.

Актуальнасць вывучаемай праблемы тлумачыцца, перш за ўсё, культуралагічнай цікаўнасцю да нацыянальных духоўных асноў; імкненнем да адраджэння сваіх айчынных вытокаў, да ўсведамлення ўласнай ментальнай самабытнасці. Дадзенае даследаванне накіравана на асэнсаванне сучаснай мастацка-музычнай пасхальнай спадчыны Беларусі, ва ўмовах, калі краіна перажывае сацыяльна-эканамічныя рэформы і духоўнае адраджэнне.

Народныя традыцыі святкавання ўваскрасення Хрыстовага, ці, як кажуць у народзе, Вялікадня (Вяліканне, Вельканоц, Пасха) на Беларусі маюць цесную сувязь з рэлігійным святкаваннем Пасхі. Велікодны перыяд, згодна з каталіцкай традыцыяй, працягваецца ад Пасхальнай вігіліі да нядзелі Спаслання Духа Святога. Пасху папярэджвае перыяд Вялікага посту. Ён працягваецца 40 дзён (без уліку нядзелі) і заканчваецца ў Вялікі чацвер. Вялікі пост – час падрыхтоўкі да сустрэчы з уваскрослым Хрыстом. У гэты перыяд Касцёл збірае вернікаў на набажэнствы Крыжовага шляху і Песняў-жальбаў[1].

Дамінуючае месца ў традыцыйнай беларускай рымска-каталіцкай пасхальнай музычнай культуры займае ***сакральна-***

[1] Песні-жальбы – набажэнства эўхарыстычнага характару у тэкстах які закладзена гісторыя мукі і смерці Езуса Хрыста.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***духоўная*** музыка. Яна праяўляецца праз літургічную музыку Трыдыума пасхальнага[2].

Літургічная музыка – гэта музыка, якая выконваецца падчас набажэнстваў і мае сакральны характар, створаная згодна з царкоўнымі канонамі, як музычнымі так і тэкставымі. Вылучаюць наступныя віды пасхальнай музыкі рымска-каталіцкай царквы: грыгарыянскі харал («Exsultet» – Абвяшчэнне Пасхі), сакральная паліфонія старадаўняя і сучасная («З радасцю ўсклікні, зямля, на славу Пана», муз. Д. Куш), канты («Аллелюя! Бог Ускрос»), рэлігійныя песні («Радуймася, хрысціяне»), арганная музыка.

Хрысціянства, якое распаўсюдзілася па ўсіх еўрапейскіх дзяржавах, дало імпульс для развіцця самабытнага музычна-песеннага мастацтва ў кожнай мясцовай Царкве. Песні з тэкстамі, адаптаванымі для ўспрымання шырокімі коламі грамадства, традыцыйна служылі для разумення пасхальнага багаслоўя і катэхізацыі; да іх адносяцца духоўныя вершы, рэлігійныя песні, песні паломніка, песні богагласніка. Напрыклад, рэлігійныя песні – «Б’юць званы, быццам спяваюць»[3], «Перастаньма сумаваці», «А на моры тонка кладка»[4] і інш.; духоўны верш – «Слава Богу за ўсё»[5].

Рэлігійныя песні маюць цесную сувязь (як музычную так і тэкставую) з літургічнымі, што зазначае Л. Густова ў сваіх даследваннях у галіне ўзаемадзеяння прафесійнага царкоўнага і беларускага народна-спеўнага мастацтва [1, с. 126–131]. Згодна з Канстытуцыяй «Sacrosanctum Concilium», выдадзенай Другім Ватыканскім Саборам (1962–1965), традыцыйная музыка можа выкарыстоўвацца ў літургіі (за выключэннем асноўных частак лацінскай літургіі), а таксама ў паралітургічных набажэнствах. У 6 главе ў параграфах 118 і 119 напісана: «Паколькі ў некаторых краінах, асабліва місіянерскіх, ёсць народы, якія валодаюць уласнымі традыцыямі музычнага мастацтва, якія выконваюць важную ролю ў іх рэлігійным і грамадскім жыцці, гэтай музыцы належыць адводзіць адпаведнае месца…» [2, с. 47]. Папа Пій XII у энцыкліцы аб сакральнай музыцы «Encyklika musicae sacrae disciplina» (1955) звяртае ўвагу на тое, што трэба цаніць таксама і

[2] Пасхальны Трыдыум (лац. triduum – тры дні) – самая важная падзея ў літургічным годзе каталікоў, сутнасць якой з’яўляецца святкаванне Мукі, Смерці і Уваскрасення Хрыстовага. Пачынаецца з вячэрняй імшы ў Вялікі чацвер (Імша Вячэры Гасподняй) і заканчваецца другім нешпарам Велікоднай нядзелі.

[3] Запіс песень зроблены (06.04.2013) у парафіі св. Троіцы г. Докшыцы Віцебскай вобл. пад час Святой Імшы.

[4] Песня запісана (27.04.2008) ад каталічкі Веранікі Сіўко (1934–2011) і праваслаўнай Марыі Раманенкавай (1931–2010), жыхаркі Докшыцкага раёна Віцебскай вобл.

[5] Песня запісана (03.09.2012) ад парафіян в. Дунілавічы Лідскага раёна.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тую музыку (маецца на ўвазе традыцыйная музыка), якая не належыць непасрэдна да Святой Літургіі, але прыносіць значную карысць для рэлігійнага жыцця вернікаў, дзякуючы чаму можа называцца «рэлігійнай музыкай» [3, с. 72]. Аб прысутнасці ў хрысціянскім жыцці католікаў на Беларусі традыцыйных рэлігійных песень сведчасць музычныя зборнікі, якія выкарыстоўваліся вернікамі на літургіі, напрыклад: «Kantyczka czyli Pieśni nabożne» (1885), «Cantus ecclesiastici» (1911), «Cantionale ecclesiasticum Romano-catholicicum» (1862)[6], у іх друкаваліся ноты і тэксты літургічных і рэлігійных песень, дзе асобнае месца займалі песні на Вялікі пост і Пасху, а таксама даваліся невялікія каментарыі да святаў.

Рэлігійная музыка спрыяе паглыбленню эмацыйна-асабовых адносінаў чалавека да рэлігіі і ўзмацняе містычную атмасферу рэлігійных сакрамэнтаў, накіраваных на разуменне і збліжэнне з Богам. Музыка дапамагае чалавеку ўзвысіцца, раскрыць яго духоўную сутнасць і тым самым наблізіцца да Бога.

Пасхальная музычная культура рымска-каталіцкай традыцыі на Беларусі выконвае канкрэтныя функцыі: ***эстэтычная*** – забеспячэнне артэфакту магчымасці служыць крыніцай эстэтычнай інфармацыі (музыка, спевы, тэатралізацыя); ***аксіялагічная*** – здольнасць абраду фарміраваць у асобнага чалавека, калектыва людзей каштоўнасныя арыентацыі аб традыцыйнай культуры; ***дыдактычная*** – адлюстраванне фальклорнай абраднасцю адвечных імкненняў народа да дабра і праўды, да святла і шчасця. (маральныя ідэалы выхоўваюць шматлікія пакаленні); ***антрапалагічная*** – апавяданне пра значныя гістарычныя змены ў чалавечай свядомасці, развіцці культуры і росце ведаў у тэкстава-лексічнай сістэме (у выглядзе тэкстаў песень). І, нарэшце, абрады дапамагаюць захаваць ***культурна-гістарычную*** сувязь паміж пакаленнямі, забяспечваючы ўнутрана-культурную пераемнасць.

Па выніках праведзенага намі апытання ўдзельнікаў некаторых харавых супольнасцей[7] можам сцвярджаць, што пасхальная рэлігійная музыка з'яўляецца найбольш распаўсюджаным рэпертуарам вернікаў, які яны ведаюць на памяць і з задавальненнем спяваюць. 95% апытаных харыстаў падкрэсліваюць

---

[6] Пералічаныя зборнікі песень зафіксаваны ў 2012–2013 гг. падчас навуковых экспедыцый па Гродзенскай і Віцебскай абласцях.

[7] Хор «Gloria Dei» пры каталіцкай Царкве Святой Троіцы ў г. Докшыцы Віцебскай вобласці, хор парафіі св. Яна Хрысціцеля ў в. Ваўкалата Віцебскай вобласці, хор парафіі св. Станіслава ў в. Даўгінава Мінскай вобласці, хор парафіі Узвышэння Святога Крыжа ў г. Ліда Гродзенскай вобласці і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выхаваўчую ролю гэтай музыкі; перш за ўсё – за рэлігійны сэнс твора, па-другое, музыка дапамагае зразумець эмацыйны стан пэўных момантаў святой літургіі, па-трэцяе, пры выкананні творы вядомых кампазітараў (напрыклад, хор «Аллелюя» з араторыі «Місія» Гендэля і інш), можна пазнаёміцца з вялікай спадчынай сусветнага музычнага мастацтва. Некаторыя ўдзельнікі харавых калектываў зазначаюць тое, што харавыя рэпетыцыі заахвочваюць іх да пастаяннай прысутнасці на набажэнствах і выхоўваюць, тым самым, адказнасць перад самім сабой і Богам за рэгулярнае наведванне святыні.

Такім чынам, пасхальная музычная культура рымска-каталіцкай традыцыі ўсё больш і больш адмяжоўваючы сабе прастору ў гісторыі таго ці іншага народа, які абазначыў сябе на глебе гістарычнага развіцця ўсяго чалавецтва, у рэшце рэшт становіцца самастойным прадметам параўнальнай навукі, якая, разбураючы перашкоды гістарычнай адасобленасці грамадскасці, даследуе яе асноўныя элементы і натуральнае развіццё, незалежна ад штучных пластоў гістарычнай цывілізацыі, мовы, рэлігіі, пачаткаў сямейнага і грамадскага побыту, народнай паэзіі і звычайнага права, – гэта галоўныя рэчы, на якіх яна грунтуецца.

1. *Густова, Л. А.* Белорусская народно-песенная и религиозная культуры: историко-коммуникативный аспект (по материалам экспедиций Гродненщины и Белосточчины) / Л. А. Густова // Палявая фалькларыстыка і этналогія даследавання лакальных культур Беларусі: навук. зб. / уклад. І. Ю. Смірновай ; навук. рэд. В. А. Лабачэўская. – Мінск : БДУКМ, 2008. – С. 126–131.

2. Документы II Ватиканского собора 1962–1965 / пер. Андрея Коваля. – Москва : Паолине, 1998. – 589 с.

3. Encyklika Musicae sacrae disciplina 1955 r. / Wiadomości Diecezjalne. – Katowice : Organ Urzędowy Archidiecezji Katowickiej. 1957–61. – 83 s.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ